Culture & Creativity
EU-Eastern Partnership Programme



# УПЛЫЎ КУЛЬТУРЫ НА РЭГІЯНАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ І ГОРАДАБУДАЎНІЦТВА

## *Уклад у паляпшэнне інфраструктуры*



Праграма фінансуецца
Еўрапейскім Саюзам

# Прадмова

У канцы 1970-х, калі пачаўся заняпад прамысловай эканомікі, узровень жыцця ў большасці гарадоў Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі, якія былі цэнтрамі прамысловага і культурнага жыцця на працягу амаль усяго XX стагоддзя, рэзка пагоршыўся. Узровень беспрацоўя рос, буйныя гарады пусцелі, іх жыхары масава пераязджалі ў правінцыю. Пераход да эканомікі, якая сыходзіць каранямі ў творчасць, веды і інавацыі, вяртае гарады ў цэнтр увагі, абапіраючыся на яго адукацыйныя рэсурсы, яго магчымасці ў садзейнічанні абмену вопытам і дзелавым аперацыям, яго культурныя ўстановы і насычанае мастацкае жыццё і дынамізм, яго фонд будынкаў і інфраструктуру, а таксама яго транспартную сістэму. Горад стаў успрымацца як каталізатар магчымасцей.

У аднаўленні мелі патрэбу вялікая колькасць старых і закінутых прамысловых аб'ектаў інфраструктуры і нават жылых кварталаў, дзе раней жылі рабочыя прадпрыемстваў і заводаў. Людзям, роўна як і будынкам, трэба было задаць новыя напрамкі і адкрыць новыя магчымасці. Крэатыўная эканоміка і станаўленне індустрыі культуры і крэатыўнасці (ІКТ) дапамаглі гарадам знайсці адказы на гэтыя пытанні.

У сваёй даследчай працы «Крэатыўнасць, культура і горад: узаемасувязь» Чарльз Лэндру (Charles Landry) піша: «Сотні і сотні складскіх памяшканняў, бровараў; цягнікі, аўтобусы і пажарныя дэпо; заводы цэментнай, вугальнай, тэкстыльнай, тытунёвай і сталеліцейнай прамысловасці; старыя рынкі, казармы і працоўныя раёны па ўсім свеце былі пераўтвораны ў культурныя і навукова-адукацыйныя цэнтры, бізнэс-інкубатары, пляцоўкі для станаўлення новых кампаній і хабы для больш маштабнага аднаўлення гарадскога асяроддзя. Такія месцы прыцягваюць людзей творчых прафесій, у прыватнасці музыкантаў, дызайнераў-афарміцеляў, мастакоў і акцёраў. Іх прысутнасць паставіла гэтыя месцы ў авангард адраджэння гарадоў».

Як сцвярджае эканаміст Гарвардскай школы бізнэсу Майкл Портэр (Michael Porter), станаўленне індустрыі культуры і крэатыўнасці часцяком ідзе ў цеснай сувязі з развіццём кластараў. Кластары пашыраюць магчымасці для абмену ведамі і вопытам паміж прадпрымальнікамі ў крэатыўных галінах. Яны значна стымулююць інвестыцыі ў аднаўленне і перабудову інфраструктуры. У Дакладзе Еўрапейскай сістэмы назірання за развіццём кластараў па крэатыўных галінах за 2013 год адзначаецца, што аснову ІКТ заўсёды складаюць творчыя рэсурсы і традыцыі асобна ўзятай мясцовасці. Згодна з Дакладам, культурная спадчына, у тым ліку прамысловая, з'яўляецца ключавым элементам развіцця крэатыўнай эканомікі і кластараў.

Праграма Еўрапейскай Камісіі «Культурныя сталіцы Еўропы» прадаставіла розныя крыніцы буйных інвестыцый у інфраструктуру гарадоў. Капітальныя ўкладанні накіроўваліся непасрэдна на развіццё культурнай інфраструктуры (музеі, тэатры, культурныя цэнтры і г.д.), а таксама на абнаўленне аблічча горада (паркаў, плошчаў, асвятленне, развіццё грамадскага сектара) і транспартнай інфраструктуры (аэрапортаў, жалезных дарог, аўтамагістраляў і г.д.)

На сённяшні дзень мноства гарадоў рэгіёну Усходняга партнёрства знаходзяцца ў тых самых умовах, пра якія гаворка ішла вышэй. Шырокая вытворчая інфраструктура, якая дасталася ў спадчыну ад заіндустралізаванай эканомікі Савецкага Саюза, стаіць без справы і з'яўляецца хутчэй цяжарам, чым актывам. Нягледзячы на разуменне важнасці і каштоўнасці культурнай спадчыны, яна прыходзіць ва ўсе большы заняпад. Прадухіліць гэты працэс можа толькі поўнае змяненне канцэпцыі і стратэгіі па адраджэнні гарадоў і аднаўленні інфраструктуры.

# Лічбы і факты

- Згодна з **Дакладам ЮНЭСКА аб крэатыўнай эканоміцы** (2013 г.), больш за палову насельніцтва зямнога шара на сённяшні дзень жыве ў буйных гарадах, і **да трох чвэрцяў усёй эканамічнай дзейнасці адбываецца ў іх жа**.
- У аснове крэатыўнай эканомікі ляжаць мясцовыя традыцыі, веды, навыкі і арыгінальныя напрацоўкі. Яна пераважна характэрна для буйных гарадоў і рэгіёнаў, **дэманструючы ім, якім чынам яны могуць пераарыентавацца і па-новаму пазіцыяніраваць** сябе на сусветным рынку.
- З развіццём турыстычнай індустрыі ва ўсім свеце Еўропа стала ключавым напрамкам культурнага турызму. Велізарная колькасць турыстаў-прыхільнікаў культуры прыязджае як з далёкіх, так і з суседніх краін, каб наведаць сусветна вядомыя культурныя аб'екты і славутасці, якімі так багата Еўропа. Па наяўных ацэнках, **на долю культурнага турызму прыпадае каля 40%** ад усяго еўрапейскага турызму (уключаючы як проста турыстаў, так і людзей, якія спецыяльна прыязджаюць з мэтай культурнага турызму).
- Інвестыцыі ў праекты, звязаныя з інфраструктурай, маюць **непасрэдны ўплыў** на праектаванне і будаўніцтва грамадзянскіх аб'ектаў на мясцовым і рэгіянальным узроўні, а таксама на сумежныя сектары. Дадзеныя пра аб'ёмы капітальных укладанняў (у еўра) у рамках праграмы «Культурныя сталіцы Еўропы» за перыяд да 2011 года ўтрымліваюць наступныя лічбы: Капенгаген у 1996 годзе – 219 млн., Брусэль у 2000 годзе – 82 млн., Порту ў 2001 годзе - 168,5 млн., Жэнева у 2004 годзе – 200 млн., Патры ў 2006 годзе – 100 млн., Ліверпуль у 2008 годзе – 984 млн., Лінц у 2009 годзе – 300 млн., Вільнюс у 2009 годзе – 442 млн., Печ у 2010 годзе – 141 млн. і Турку ў 2011 годзе – 145 млн.
- Культура ў цэлым і ІКТ у прыватнасці аказвае **непасрэднае ўздзеянне на кошт гарадской нерухомасці,** з'яўляючыся ключавым элементам культуры, культурных стратэгій аднаўлення гарадскога асяроддзя. Гэта ўздзеянне можа стаць вынікам як буйных флагманскіх праектаў, такіх як праекты адраджэння культурнай спадчыны і крэатыўныя кластары, так і невялікіх крэатыўных мікрапрадпрыемстваў або невялікіх праектаў актывістаў культуры.

# Рашэнні

*Прыклад № 1*

**Шапрон** — гэта невялікі венгерскі гарадок, размешчаны на мяжы з Аўстрыяй. Наймацнейшы пажар у 1676 годзе практычна цалкам знішчыў горад, але на працягу наступных дзесяцігоддзяў ён быў цалкам адноўлены і памяняў сваё архітэктурнае аблічча з ранейшага сярэднявечнага на барока. Прыгонны квартал Шапрона славіцца сваёй разнастайнасцю архітэктурных стыляў, якія прыжыліся тут на працягу наступных гадоў. Сцены і падмурак, якія захаваліся з часоў Рымскай Імперыі ў спалучэнні з калейдаскопам будынкаў эпох Сярэднявечча, Адраджэння і барока сведчаць пра стабільнасць, росквіт і багатую гісторыю квартала.

Галоўнымі праблемамі гэтага раёна, аднак, былі празмерная загружанасць дарог, адсутнасць цэльнасці і завершанасці гарадскога пейзажу, вялізныя заторы на дарогах з-за недахопу парковачных пляцовак, а таксама недастатковая асветленасць і, як вынік, пустыя гарадскія вуліцы пасля наступлення цемры. Усе гэтыя фактары зніжалі прывабнасць гістарычнага цэнтра і рабілі яго небяспечным як для мясцовага насельніцтва, так і для гасцей горада.

У пошуках рашэнняў гэтых праблем гарадскія ўлады абвясцілі конкурс «Шопрон – адраджэнне Прыгоннага квартала». Мэта гэтага конкурсу заключалася ў тым, каб добраўпарадкаваць ваколіцы гістарычнага горада і зрабіць іх больш функцыянальнымі.



Першы этап, які прадугледжвае ўладкаванне 15 000 кв. м. грамадскай прасторы, быў завершаны ў 2015 годзе. У рамках гэтага этапу цэнтральная частка Прыгоннага квартала была адведзена выключна для пешаходаў і веласіпедыстаў. План адраджэння квартала складаўся з трох асноўных пунктаў:

1. Прыярытэт аддаецца пешаходам. Мэта заключалася ў тым, каб зрабіць горад зручным для яго гасцей, асноўная маса якіх – гэта людзі, якія прыязджаюць без асабістага транспарту. Таму асноўную нагрузку было вырашана перанесці за рысу гістарычнага цэнтра на акружную дарогу. Тыя дарогі, што засталіся, для руху аўтатранспарту былі надзейна агароджаны ад веласіпедных дарожак і тратуараў. Невялікі інфармацыйна-турыстычны пункт з даведкавымі стойкамі і грамадскімі туалетамі, размешчаны ў самым цэнтры, сваім знешнім выглядам нагадваў адрэстаўраваныя пабудовы канца XX стагоддзя. Ён адразу кідаецца ў вочы, але пры гэтым ненадакучліва гармануе з гістарычнымі будынкамі.

2. Павага да гісторыі праз заніраванне тэрыторыі. Архітэктары выкарыстоўвалі сучасныя матэрыялы, але здолелі іх правільна ўпісаць у гарадскі ландшафт, захоўваючы архітэктурны баланс і дух мястэчка. Для розных функцыянальных зон выкарыстоўваліся розныя матэрыялы.

3. Пошук індывідуальнасці. Для ўладкавання грамадскай прасторы і зон адпачынку ў праекце быў зроблены акцэнт на багацце і разнастайнасць спадчыны горада. Гэта падкрэсліла і дало магчымасць годна ацаніць гістарычную забудову, якая складае аснову горада. Галоўная ідэя заключалася ў тым, каб кожны чалавек мог адчуць сябе часткай гэтага архітэктурнага дзейства, у якой бы кропцы квартала ён ні знаходзіўся.



***Вынікі:***

- Квартал стаў больш бяспечным і ажыўленым раёнам, што павысіла якасць жыцця мясцовага насельніцтва.
- У квартале была добраўпарадкавана грамадская прастора, дзе людзі могуць мець зносіны і з задавальненнем бавіць вольны час. Вонкавая мэбля, вулічнае асвятленне, фантаны і сезонныя пляцоўкі не толькі падкрэслілі эстэтыку горада, але і натхнілі людзей на правядзенне фестываляў, выстаў, канцэртаў і г.д.
- У рамках праекта ўдалося злучыць сучаснасць і мінулае, умацаваць сувязі паміж усходнімі і заходнімі суседзямі ўнутры краіны.

### *Прыклад № 2*

**Эйндховен** — пяты па велічыні горад Нідэрландаў, у якім некалі з'явілася на свет кампанія Philips. Пасля заснавання кампаніі ў 1892 годзе дзякуючы прытоку інвестыцый і працоўнай сілы горад пачаў развівацца, ператварыўшы Эйндховен у буйны тэхналагічны і прамысловы цэнтр. У 2000 годзе кампанія спыніла тут сваю дзейнасць, і горад пагрузіўся ў дэпрэсію. Раён Страйп (Strijp), дзе знаходзілася кампанія, таксама вядомы як «Забаронены горад» (з-за навакольнага яго плота), стаў закрытай зонай плошчай 270 000 кв.м.

- Галоўная задача для горада заключалася ў тым, каб пераарыентавацца і стаць цэнтрам крэатыўнасці і інавацый. Гэта таксама меркавала пераасэнсаванне таго, як эфектыўна выкарыстоўваць і перапланаваць усю закінутую тэрыторыю «Забароненага горада», прыстасаваўшы або аднавіўшы наяўную інфраструктуру такім чынам, каб яна задавальняла патрэбы горада і стала часткай яго сучаснай структуры.
- Для таго каб пераўтварыць раён у новы крэатыўны і культурны цэнтр Эйндховена і зноўку адкрыць для сябе яго прамысловую спадчыну, быў распрацаваны Генеральны план комплекснага развіцця раёна «Страйп-С» (Strijp-S).
- «Страйп-С» павінен быў аб’яднаць людзей творчых прафесій, прадпрымальнікаў і грамадскасць, якая змагла б даведацца пра творчы і культурны патэнцыял мастацтва і тэхналогій, годна ацаніць гэты тандэм на Галандскім тыдні дызайну, фестывалі мастацтва і тэхналогій STRP і фестывалі светлавога мастацтва Glow NXT (LightArt).
- Эйндховен падаваў заяўку на атрыманне статусу «Культурнай сталіцы Еўропы ў 2018 годзе». Нягледзячы на тое, што заяўку адхілілі, горад працягвае нарошчваць сваю культурную інфраструктуру, звязваючы мастацтва і культуру з тэхналогіямі і інавацыямі, робячы іх даступнымі для шырокай грамадскасці.



***Развіццё інфраструктуры:***

Дзякуючы ініцыятыве «Страйп-С» прамысловая зона Эйндховена ператварылася ў крэатыўны і культурны квартал. Шмат у чым ён стаў паказальным прыкладам развіцця і аднаўлення канкрэтнага раёна са стварэннем стратэгічнай інфраструктуры:

- У 2008 годзе быў заснаваны фонд прыватнага і дзяржаўнага фінансавання «Cultuurfonds Strijp-S» для стымулявання правядзення крэатыўных ініцыятыў, мерапрыемстваў і праграм на пляцоўках раёна Страйп-С, а таксама для ўмацавання іміджу Страйп-С на нацыянальным і міжнародным узроўні. Фонд аказвае падтрымку культурных і крэатыўных праектаў у выглядзе грантаў на сумы ад 5 000 да 25 000 еўра.
- З 2010 года ў Klokgebouw, галоўным будынку раёна Страйп-С, абгрунтавалася 100 крэатыўных кампаній.
- На Apparatenfabriek, былой фабрыцы па вытворчасці прылад Philips, выдзелена амаль 20 000 кв. футаў гандлёвай і працоўнай прасторы для ІКТ. Акрамя таго, іншыя будынкі кампаніі Philips былі пераабсталяваны ў лофты, месцы для правядзення вольнага часу (скейт-паркі, пляцоўкі для правядзення фестываляў), рэстараны і крамы (комплекс будынкаў Anton & Gerard, Ketelhuis, Machinekamer).
- У 2013 годзе вядомы будынак Natlab (былая навукова-даследчая лабараторыя кампаніі Philips) зноў адкрыла свае дзверы, зараз ужо ў якасці культурнай прасторы, якая змяшчае кінацэнтры, тэатр і дзве медыялабараторыі.
- Агульная сума ўсіх інвестыцый на культуру ў раёне Страйп-С склала 36,5 мільёна еўра. Большая частка гэтых сродкаў для Страйп-С паступіла ад прыватных інвестараў; 1% склалі сродкі, прадастаўленыя ЕС (праекты BLISS, INTERREG IVB паўночна-заходняя Еўропа).



***Наступствы:***

- Раён «Страйп-С» стаў высокатэхналагічным культурным і крэатыўным цэнтрам Эйндховена, прыцягваючы новыя віды і формы дзейнасці, у першую чаргу ў крэатыўных галінах.
- Закінутая тэрыторыя і абуза горада стала яго сэрцам, змяніўшы ўсю яго інфраструктуру і камунікацыі. У мінулым Эйндховен славіўся проста прамысловым мястэчкам, а зараз здолеў стаць сапраўдным горадам, домам для яго жыхароў і важным крэатыўным цэнтрам. Дэпрэсію і эканамічны спад змяніла высокая якасць жыцця.
- У 2011 годзе Эйндховен атрымаў тытул Інтэлігентнага рэгіёну года, а ў 2013 годзе быў прызнаны самым вынаходлівым горадам у свеце.
- Нядаўна гарадскія ўлады набылі яшчэ адну велізарную суседнюю тэрыторыю і будынак, кацельню, у раёне Страйп-Т (Strijp-T) (побач з раёнам Страйп-С), дзе плануецца ўладкаваць большую прастору для крэатыўных індустрый (і для правядзення маштабных мерапрыемстваў).



# Вынікі і Ўплыў

- **У аснове ўстойлівага развіцця гарадоў ляжыць адказнае развіццё.** Яно дазваляе знайсці баланс паміж неабходнасцю захаваць аб'екты гістарычнага значэння і культурнай спадчыны, актуальнымі патрэбамі мясцовага насельніцтва і горада ў цэлым, уражаннямі патэнцыйных наведвальнікаў і наяўнымі рэсурсамі.
- **Змясціўшы культуру ў аснову праграм па рэканструкцыі горада, можна атрымаць такія перавагі:** больш шырокае і інклюзіўнае разуменне культуры; прызнанне важнасці фактараў, звязаных з ладам жыцця мясцовага насельніцтва, і дзейнасці ў сферы спажывання пры распрацоўцы планаў па добраўпарадкаванні гарадоў; развіццё новай культурнай інфраструктуры, якая змяняе аблічча горада і якая прываблівае турыстаў і інвестыцыі.
- **Культурныя мерапрыемствы і ўстановы спрыяюць больш эфектыўнаму гарадскому кіраванню,** стварэнню новага горада, арыентаванага на патрэбы сваіх жыхароў, горада, здольнага аб'яднаць матэрыяльныя і нематэрыяльныя аспекты дабрабыту і адмовіцца ад неэфектыўных і няўстойлівых мадэляў і функцыянальных сродкаў, характэрных для гарадоў мінулага стагоддзя.
- **Аднаўленне закінутых тэрыторый горада з дапамогай культуры** станоўчым чынам сказваецца на дабрабыце яго жыхароў, забяспечвае шырокі доступ да культуры для самых розных груп насельніцтва, тым самым умацоўваючы сацыяльную згуртаванасць. Яно таксама можа дапамагчы гораду развівацца ў розных напрамках, стаць больш прыстасаваным для патрэб і інтарэсаў жыхароў і турыстаў.
- **Да праблем крэатыўнай эканомікі** і кластараў можна аднесці паступовае ператварэнне мастацтва і культуры ў адзін са сродкаў забаў і форму паслуг, магчымасць узнікнення супярэчнасцей паміж эканамічнай і сацыяльнай праграмамі развіцця, джэнтрыфікацыю і нераўнамернасць размяшчэння гарадскога насельніцтва.

# Рэкамендацыі

- Пераўтварэнне інфраструктуры і павышэнне каштоўнасці тэрыторый і раёнаў – гэта складаны працэс, у рамках якога неабходна **захоўваць раўнавагу паміж сацыяльнымі і эканамічнымі патрэбамі горада і яго жыхароў.** Не варта ствараць монафункцыянальныя (напрыклад, выключна для турыстычных мэт) і закрытыя для агульнага доступу (напрыклад, т.зв. «элітарныя») гарадскія прасторы. Планаванне і стварэнне як жыллёвай, так і турыстычнай інфраструктуры павінна адбывацца асабліва дбайным чынам.

- Планы па ўладкаванні або перабудове інфраструктуры павінны ўключаць **тры важныя і непарыўна звязаныя паміж сабой складнікі:** культурная інфраструктура (музеі, тэатры, арт-цэнтры і г.д.), рэканструкцыя гарадскога асяроддзя (паркі, плошчы, асвятленне, добраўпарадкаванне грамадскай прасторы) і транспартная інфраструктура (аэрапорты, чыгуначныя вузлы і шляхі, дарогі і г.д.)

- **Тэрыторыі грамадскага карыстання вельмі важныя для фарміравання самабытнасці і ландшафту горада.** Гэта месцы для сацыяльнага ўзаемадзеяння, якія належаць усім жыхарам горада, пра што нельга забываць пры планаванні змяненняў у інфраструктуры горада. Грамадскія пляцоўкі і інфраструктура горада павінны спрыяць далучэнню розных слаёў насельніцтва да культуры і формам культурнага самавыяўлення ў грамадскіх месцах горада.

- **Культурная спадчына** можа стаць асновай для развіцця ІКТ і крэатыўных кластараў. Адраджэнне і павышэнне каштоўнасці культурнай спадчыны можа спрыяць аднаўленню праблемных і аддаленых раёнаў (былых прамзон, аб'ектаў, аддаленых ад традыцыйных турыстычных маршрутаў і г.д.). **Пабудова ІКТ вакол аб'ектаў культурнай спадчыны істотна паляпшае іх устойлівасць** з пункту гледжання задавальнення эмацыйных і фінансавых патрэб і дазваляе палепшыць уражанні наведвальнікаў, робіць такія аб'екты часткай сучаснай культуры.

- Адраджэнне горада магчыма праз рэалізацыю **буйнамаштабных флагманскіх праектаў** (напрыклад, узвядзенне знакавага аб'екта горада – новага музея, тэатра або культурнага цэнтра). Гэта доўгатэрміновая інвестыцыя ў аблічча горада і яго турыстычную прывабнасць. Аднак да арганізацыі флагманскіх праектаў варта падыходзіць асцярожна, паколькі яны могуць прывесці да стварэння монафункцыянальнай прасторы, некамфортнай для жыхароў горада, і перагружанасці транспартнай інфраструктуры горада. Неабходна забяспечыць падтрымку планаў развіцця, якія прадугледжваюць збалансаваную рэканструкцыю горада як адзінага цэлага.

- **Празрыстасць, пастаянныя кансультацыі, супрацоўніцтва і адкрыты дыялог** — галоўныя фактары паспяховага кіравання працэсамі па адраджэнні горада. Цеснае супрацоўніцтва з мясцовым насельніцтвам, правядзенне грамадскіх слуханняў і адкрытых архітэктурных конкурсаў – вось толькі некаторыя з прыкладаў перадавога вопыту.

- Развіццё матэрыяльнага складніка (збудаванняў) культурнай інфраструктуры прадугледжвае падтрымку **развіцця і яе нематэрыяльнага складніка** — культурных установаў і праектаў, малых і сярэдніх крэатыўных прадпрыемстваў і платформаў.

# Дадатковая інфармацыя

**Нэнсі Дзюксбуры, Джоці Хосаграхар, Жорзі Паскуаль, «Павестка дня на XXI стагоддзе для культуры. Чаму ў аснове ўстойлівага развіцця гарадоў павінна ляжаць культура?», 2016 г.**

http://www.agenda21culture.net/images/a21c/articles/documentos/Culture_SD_cities_web.pdf

**Даклад аб крэатыўнай эканоміцы ЮНЭСКА за 2013 г.**

http://www.unesco.org/culture/pdf/creative-economy-report-2013.pdf

**Чарльз Лэндру, «Крэатыўнасць, культура і горад: узаемасувязь», 2010 г.**

https://www.forum-avignon.org/sites/default/files/editeur/ECCE_report.pdf

**Культура для гарадоў і рэгіёнаў**

http://www.cultureforcitiesandregions.eu

**Еўрапейская сістэма назірання за развіццём кластараў - «Крэатыўныя галіны: аналіз базавых умоў асобных галін, якія маюць значэнне для развіцця кластараў міжнароднага класа», 2013 г.**

http://www.emergingindustries.eu/Upload/CMS/Docs/Creative_industries_FCs.pdf

**«Культурныя сталіцы Еўропы. 30 гадоў», 2015 г.**

https://ec.europa.eu/programmes/creative-europe/actions/capitals-culture_en

**Майя Ламза-Мароніч, Ерко Главаш, Ігар Маўрын, «Культура і / або развіццё? Кіраванне праектамі па развіцці гарадской і рэгіянальнай інфраструктуры ў рамках праграмы «Культурныя сталіцы Еўропы»**

http://www.efos.unios.hr/repec/osi/journl/PDF/InterdisciplinaryManagementResearchIX/IMR9a73

**Ян ванн дэр Борг і Антонія Паола Русо, «Уплыў культуры на эканамічнае развіццё гарадоў», Еўрапейскі інстытут параўнальных урбаністычных даследаванняў (EURICUR), 2015 г. Ратэрдамскі ўніверсітэт Эразма**

https://www.wien.gv.at/meu/fdb/pdf/intern-vergleichsstudie-ci-959-ma27.pdf

**Ад прахадной дарогі да папулярнага гістарычнага цэнтра горада**

http://landarchs.com/historic-urban-center/

**Страйп-С**

http://www.strijp-s.com/Introduction